УДК 821.161.3.09

# БЕЛАРУСКІЯ ПАЭТЭСЫ – ВЫПУСКНІЦЫ БДУ

***Ірына Шматкова***
*дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*
i.shmatkova@gmail.com

У артыкуле разглядаюцца творчыя набыткі беларускіх паэтэс – выпускніц Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аналізуецца адметнасць іх лірычнай спадчыны, вызначаецца роля іх творчасці і прафесійнай дзейнасці ў гісторыі беларускай літаратуры і культуры.

***Ключавыя словы: беларускія паэтэсы, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, творчасць, гісторыя беларускай літаратуры.***

# BELARUSIAN POETS ARE GRADUATES BSU

***Iryna I. Shmatkova***
*Belarusian State University, Minsk, Belarus*

The article examines the creative achievements of Belarusian poetesses - graduates of the Belarusian State University, analyzes the originality of their lyrical heritage, determines the role of their creativity and professional activity in the history of Belarusian literature and culture.

***Keywords: Belarusian poetesses, philological faculty, Belarusian State University, creativity, history of Belarusian literature.***

У 1921 г. быў адчыніў свае дзверы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, што стала знакавай падзеяй у развіцці ўсіх галін навукі, адукацыі, культуры краіны, у тым ліку і гендарнай. Адкрыццё навучальнай установы вышэйшага ўзроўню на тэрыторыі Беларусі прыспела даўно. Канешне, з 1840 г. на магілёўшчыне працаваў Горы-Горыцкі земляробчы інстытут, але гэта была профільная сельскагаспадарчая навучальная ўстанова (у якой, дарэчы, у свой час працавалі М. Гарэцкі і П. Мядзёлка). Многім таленавітым беларусам прыходзілася вучыцца ў бліжэйшых Віленскім (засн. ў 1579 г.), Маскоўскім (засн. у 1755 г.), Пецярбургскім (засн. 1724 г.), Варшаўскім (засн. у 1816 г.), Кіеўскім (засн. у 1834 г.), Львоўскім (засн. у 1661 г.) і інш. універсітэтах. Прычым паступіць у гэтыя навучальныя ўстановы было няпроста, нават мужчыне, успомнім таго ж М. Гарэцкага, які прайшоў конкурс 400 чалавек на 25 месцаў пры паступленні ў Горы-Горыцкае каморніцкае вучылішча (структурнае адгалінаванне раней узгаданага інстытута) [5, с. 20].

Так, выдатная беларуская асветніца пачатку XX ст. Алаіза Пашкевіч (Цётка) сваю прагу ведаў спаталяла на вышэйшых адукацыйных курсах П. Лесгафта ў Пецярбургу (1902–1904 гг.) і на гісторыка-філалагічным факультэце Львоўскага ўніверсітэта (1907–1911 гг.). Менавіта Цётка лічыцца адной з барацьбітак за правы жанчын і іх адукацыю, яна брала ўдзел у жаночым з'ездзе ў маі 1905 г. у Маскве як дэлегатка ад беларускіх жанчын, займалася пашырэннем асветы і культуры сярод моладзі, у тым ліку і дзяўчат (успомнім яе публіцыстычны зварот "Да дзяўчатак"). Паказальныя радкі з яе ліста "Пецярбургскім студэнтам-беларусам" (1914): *"Дарагія браткі! Беларусы-студэнты! Вам пашчасцілілася: вы ўжо аж у ўніверсітэце вучыцеся. Але вашы браты, дзе каторыя мо родныя вам, асталіся ў вёсцы, там яны працуюць ад світання да змяркання, а ім жа таксама хочацца, як і вам, шмат чаго ведаць, пазнаць…"* [11, с. 216].

Дзейнасць А. Пашкевіч (Цёткі) натхніла да асветніцкай і літаратурнай дзейнасці жанчын, тым больш што палітычныя ўмовы гэтаму таксама спрыялі – з 1918 г. пры мясцовых парткамах былі створаны жанкамісіі, з 1919 г. – жанаддзелы ва ўсіх саюзных і аўтаномных рэапубліках, 5 сакавіка 1924 г. у Мінску адбыўся І Усебеларускі з'езд работніц і сялянак, з лістапада 1924 г. пачаў выходзіць часопіс "Беларуская работніца і сялянка", у 1926 г. выдадзены зборнік "8 сакавіка", у якім быў надрукаваны красамоўны верш К. Драбышэўскай – сялянкі з в. Сапожкава Магілёўскай акругі: *"Цяпер сабе сама я пані: // Хаджу ў чытальню, ў клюб хаджу. // Ламацца нада мной ня стане // Ніхто, – я грамаце вучусь"* [Цыт. па "Бліскавіцы: анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду", с. 14].

Зразумела, з адкрыццём "свайго" ўніверсітэту найбольш прагрэсіўныя і актыўныя дзяўчаты імкнуліся атрымаць адукацыю там, асабліва на педагагічным факультэце (адкрыты ў 1922 г.). Так, на этнолага-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ (1922) вучылася **Хмарка (Наталля Панамарова)** (1897 – ?), аўтарка кнігі "Апавяданне старога вожыка" (1928), пісала вершы і прозу для дзяцей і дарослых, друкавалася ў часопісах "Зоркі", "Вольны сцяг", "Полымя", альманаху "Адраджэнне" [1, с. 55–56]; **Наталля Вішнеўская** (1907–1989) – паэтэса, член літаратурнага аб'яднання "Маладняк", аўтарка сумеснага з З. Бандарынай і Я. Пфляўбаўм зборніка "Вершы", жонка беларускіх паэтаў А. Дудара, А. Звонака, Я. Бобрыка, вучылася ў БДУ з 1929 г. [1, с. 104–105]; **Яўгенія Пфляўбаўм** (1908–1996) – паэтэса, аўтарка зборнікаў "Мелодыя" (1930), "Сувой жыцця" (1989), "На захадзе сонца" (1992), жонка М. Лужаніна, вучылася на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ у 1926–1930 гг.; **Ганна Арахоўская (Базыленка)** (1908–1980) – паэтэса, пісьменніца, аўтарка калектыўнага зборніка маладнякоўцаў "Пачатак", закончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ у 1931 г., дзе працавала ў 1944–1970 гг. спачатку старшым выкладчыкам, пасля дацэнтам кафедры рускай мовы, у 1949–1955 гг. намеснікам дэкана філалагічнага факультэта БДУ [1, с. 132]; **Ядвіга Бяганская** (1908–1992) – паэтэса, пісьменніца, аўтарка шматлікіх кніг для дзяцей: "Далёка на поўначы" (1954), "Жэнеў галубок" (1958), "Сустрэча з морам" (1962), "Зосіна зорачка" (1965, 1980) і мн. інш., перакладчыца, закончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ у 1930 г. [1, с. 136–137]. На жаль, многія са згаданых аўтарак, якія прыйшлі ў літаратуру ў 1930-я гг., не змаглі паўнавартасна рэалізаваць свой талент з-за цяжкасцей 1930-х гг. і Вялікай Айчыннай вайны.

У 1935 г. рыхтавалася да паступлення ў БДУ **Ніна Тарас** (1916–2006) – беларуская паэтэса, сябра СП СССР з 1940 г., аўтарка зборнікаў вершаў "На ўсход ідучы…" (1940), "Суніцы" (1946), "Вершы" (1952), "Кветка шчасця" (выбр., 1958), "Пад белым яварам" (выбр., 1966), "У тапаліную замець" (1976), "Праметэю прыйду пакланіцца" (1981) і інш., – але зрабіць змагла гэта толькі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 35 – 36].

З чэрвеня 1941 г. БДУ спыніў сваю працу і ўзнавіў яе ў маі 1943 г. у эвакуацыі пад Масквой, а з лета 1944 г., пасля вызвалення Беларусі, – у Мінску [10]. Паэтэсы з пакалення "дзяцей вайны" прыйшлі ў літаратуру ў так называемы "перыяд дэмакратычнага абнаўлення грамадства" [7]. Літаратура папоўнілася вялікай колькасцю жаночых імёнаў, прычым для многіх з іх "паэтычнай кузняй" стаў менавіта філалагічны факультэт БДУ, які быў адкрыты яшчэ ў 1939 г.

**Вера Вярба (Гертруда Пятроўна Сакалова)** (1942–2012) вучылася на філфаку БДУ у 1958–1964 гг., да гадоў вучобы адносяцца знакавыя ў яе паэтычным лёсе даты – першая публікацыя верша (1958), надрукаваны яе першы зборнік паэзіі "Вочы вясны" (1962), у 1964 г. яна была прынята ў Саюз пісьменнікаў БССР. Адзін з яе вершаў з першай кнігі паэтэсы "Ручнікі" быў пакладзены на музыку, песня ўвайшла ў рэпертуар знакамітых "Песняроў" і зрабіла маладую аўтарку папулярнай на ўсю краіну. Адзін за другім выходзілі яе зборнікі: "Белыя пісьмы" (1967), "Высакосны год" (1969), "Сіняя бухта" (1975), "Альфа" (1978), "Мая маленькая планета" (1982), "Яраслаўна" (1986), "Апошні верасень" (1995). У сваёй творчасці паэтэса ўзвышала новую для літаратуры таго часу з'яву – жаноцкасць, якая яскрава выражалася як у асобе самой аўтаркі, так і ў яе лірыцы: увага да знешняга выгляду жанчыны, перажыванне ўзросту: *"Як гэта цяжка быць дарослай, // Як гэта цяжка быць жанчынай <…> А потым старасць, потым восень, // Хаваеш першыя маршчыны"* [3, с. 41–42], шчасце мацярынства: *"Як найшчаслівейшая жанчына, // Дзіця падносіш да грудзей. // На твары свецяцца маршчыны, // І вочы сталі маладзей"* [4, с. 37], цяжкасці ў стасунках з

калегамі-мужчынамі: *“Сябры, што выбралі пасады // І замянілі службай чын, // З якой тугою і пагардай // Яны дзівіліся з жанчын”* [2, с. 6] і многае інш.

Яшчэ адна выпускніца філалагічнага факультэта БДУ (1967) – **Вольга Іпатава** (нар. у 1945 г.) – паэтэса, пісьменніца, публіцыст, перакладчыца, аўтарка зборнікаў вершаў “Раніца” (1969), “Ліпеньскія навальніцы” (1973), “Парасткі” (1976), “Крыло” (1976), зборнікі аповесцей і апавяданняў на гістарычную тэматыку (у 2002 г. выйшла яе трылогія “Альгердава дзіда”) і інш.; свае філалагічныя навыкі В. Іпатава рэалізоўвае і як рэдактар (працавала літкансультантам газет “Літаратура і мастацтва”, “Чырвоная змена”, рэдактарам Беларускага тэлебачання, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса “Спадчына”, галоўным рэдактарам газеты “Культура” (1991–1995 гг.).

У 1969 г. філалагічны факультэт БДУ закончыла **Валянціна Коўтун** (1946–2011), якая пасля атрыманыя веды актыўна прымяняла на ніве філалогіі: працавала літкансультантам “Сельскай газеты” (1970–1976 гг.), рэдактарам аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса “Полымя”, з 1982 г. – загадчыкам рэдакцыі літаратуры для моладзі выдавецтва “Юнацтва”, з 1990 г. – старшым рэдатарам аддзела прозы часопіса “Полымя”; кандыдат філалагічных навук, член СП СССР з 1976 г., у друку пачала выступаць з 1966 г., аўтарка зборнікаў паэзіі “Каляровыя вёслы” (1971), “На ўзлёце дня” (1977), “Метраном” (1985), “Лісты да цябе” (1988), зборніка апавяданняў “Калінавая гронка залатая” (1988), шэрагу твораў для дзяцей. Адметнасцю празаічнай творчасці В. Коўтун стала раскрыццё асоб жанчын, якія адыгралі значную ролю ў гісторыі Беларусі: Алаізе Пашкевіч (Цётцы) прысвечаны паэмы “На зломе маланкі” (1979), “Суд Алаізы” (1985), раман-дылогія “Крыж міласэрнасці” (1988–1996 гг.); Еўфрасінні Полацкай прысвечаны раман з жыцця “Пакліканыя” (2002).

У 1970-я гг. філалагічны факультэт выдаў “білеты ў прафесійнае жыццё” цэлай плеядзе беларускіх паэтэс, выпускніцамі БДУ сталі: у 1971 г. – Яўгенія Янішчыц, у 1973 г. – Галіна Каржанеўская, у 1974 г. – Людміла Забалоцкая, у 1975 г. – Любоў Тарасюк, у 1977 г. – Галіна Твардовіч, у 1978 г. – Антаніна Хатэнка, у 1979 г. – Людка Сільнова і Хрысціна Лялько і інш.

Адна з самых яскравых зорачак у гэтым паэтычным сузор’і – **Яўгенія Янішчыц** (1948–1988). Яе імя нават дало назву гэтаму пакаленню, як успамінае Г. Каржанеўская ў сваёй аўтабіяграфіі: “З узростам я ўсё болей цаню сваё пакаленне – “пакаленне Жэні Янішчыц”, як яго называюць. Мае калегі і таварышы праявілі сябе вельмі рознабакова, сцвердзіліся як асобы, творцы, грамадскія дзеячы” [13, с. 133]. Я. Янішчыц была адной з самых таленавітых студэнтак філалагічнага факультэта, “любіміца выкладчыкаў”, падчас вучобы ў 1970 г. стала дыпламантам беларускага фестывалю творчай моладзі, у гэтым жа годзе выйшаў першы паэтычны зборнік “Снежныя грамніцы”, пазней – “Дзень вечаровы” (1974), “Ясельда” (1978), “На беразе пляча” (1980), “Пара любові і жалю” (1983), “Каліна зімы” (1987), зборнік выбранага “У шуме жытняга святла” (1988), на жаль, ужо пасмяротна ў 2000 г. пабачыла свет кніга “Выбранае” (укладальнікамі сталі яе паплечніцы па “паэтычнаму цэху”, “філфакаўкі” В. Коўтун і А. Канапелька). Паэтычны свет Я. Янішчыц – прыклад гранічнага лірызму, шчырасці, драматызму; каханне для яе самая высокая мерка, арганічнае выяўленне сутнасці жанчыны, што пацвярджаецца самымі запамінальнымі радкамі з яе верша, стаўшага праграмным у беларускай літаратуры: *“Пачынаецца ўсё з любві, а інакш і жыць немагчыма”* (“Ты пакліч мяне, пазаві…”) [16, с. 17].

Да гэтага, названага ёй, пакалення адносіць сябе **Галіна Каржанеўская** (нар. у 1950 г.). Пасля заканчэння ўніверсітэта, выкладала беларускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе ў Плешчаніцах Лагойскага раёна, у 1980–1982 гг. – рэдактар літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання, з 1984 г. – карэспандэнт, а пасля і загадчык аддзела крытыкі штотыднёвіка “Літаратура і мастацтва”, аўтарка кніг паэзіі “На мове шчасця” (1973), “Мой след” (1976), “Званы гадоў” (1980), “Жыла-была…” (1983), “Вечны водгук” (1988), “Невымоўнае” (1991), “Асенні мёд” (1999), “Вершаняты” (2005). Паэзія Г. Каржанеўскай спалучыла ў сабе адначасова і лірызм, і эмацыянальную стрыманасць, і драматызм. З публіцыстычнай заглыбленасцю яна адна з першых, хто раскрыў у паэзіі праблемы грамадства, якія агаліў “час перабудовы”, і рабіла гэта шчыра і прамалінейна: *“Хоць шапаткі чуваць, // Што неяк не прынята // Вам сутнасць адкрываць, – // Я быць сабою рада”* [9, с. 217]. Г. Каржанеўская таксама піша п’есы і вершы для дзяцей, выступае як крытык, перакладчыца, з’яўлялася членам СП СССР з 1976 г.

Яшчэ адна паэтэса – **Людміла Забалоцкая** (1949–2021). Скончыўшы філалагічны факультэт БДУ, працавала навуковым рэдактарам у выдавецтвах “Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі” і “Адукацыя і выхаванне”, сябра СП СССР з 1990 г., выдала зборнікі вершаў “Сакавік” (1974), “Радаводны васілёк” (1981), “Святло палыну” (1989), “Струны памяці” (1991), “У суладдзі стагоддзяў і дзён” (2004). Яе творы вылучаюцца адметным лірызмам, вобразным моўным каларытам (красамоўныя нават назвы вершаў “Ільдзінкай сіняй, плыткай, крохкай…”, “Асмужліва-журлівы сцішны ветах…”, “Грыбасей у жніўні тупатаў…” і многія інш.

З філфакам БДУ непарыўна звязаны лёс **Любові Тарасюк** (1953–2006). Скончыўшы БДУ з чырвоным дыпломам, яна з 1978 г. па 2005 г. выкладала на кафедры гісторыі беларускай літаратуры, уваходзіла ў Раду Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, праўленне Саюза пісьменнікаў і

рэдакцыйную калегію літаратунага часопіса “Маладосць”, узначальвала суполку філалагічнага факультэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991–2005), кандыдат філалагічных навук, аўтар манаграфій “Вернасць вытокам: фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі” (1985) і “Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX – пач. XX стст.” (1999), зборнікаў вершаў “Смага ракі” (1983) і “Апалогія красы” (2003). Усё, што рабіла Л. Тарасюк на ніве філалогіі, – рабіла вельмі сумленна, праніклiва, “цягавіта”, літаратар Анатоль Шушко неяк параўнаў: “Калі Яўгенія Янішчыц – ластаўка Палесся, то Люба Тарасюк – разумніца Палесся” [6], яна была вучаніцай В. Быкава і Н. Гілевіча, “яе праца па фармаванні нацыянальнай адукацыі і культуры – гэта працяг справы Алаізы Пашкевіч”, – так ахарактарызавалі калегі яе дзейнасць [6].

Яшчэ адна паэтэса і даследчыца літаратуры, выпускніца філалагічнага факультэта БДУ – **Галіна Тварановіч** (1955 г. н.)., кандыдат філалагічных навук (1985), доктар філалагічных навук (1999), аўтар паэтычных зборнікаў “Ускраек тысячагоддзя” (1996), “Верасы Дараганава” (2000), “Чацвёртая стража” (2004). Яе паэтычная творчасць прасякнута хрысціянскімі матывамі, роздумам над сэнсам чалавечага існавання, яго зямнога жыцця і Вечнасці. З 1999 г. Г. Тварановіч выкладае ва Ўнівесітэце ў Беластоку (Польшча).

**Антаніна Хатэнка** (нар. у 1956 г.) – пасля заканчэння філалагічнага факультэта БДУ працавала настаўніцай ў Задор’еўскай сярэдняй школе, пасля ў кнігарні “Палітычная кніга” (1979–1981 гг.), рэдактарам выдавецтва “Народная асвета” (1982 – 1985 гг.), у Белтэлерадыёкампаніі, Беларускім фондзе культуры, Літаратурным музеі Янкі Купалы, спецыялістам па этнаграфіі ААТСП “Іўкон”. Аўтар кніг “Здзічэлае рэха вясны”, “Зніч крыжовых дарог” (1992), “Чалавек на далоні Сусвету”, “Тры грацыі” (2002) і інш., сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, культуролаг, этнограф.

**Людка Сільнова** (нар. у 1957 г.) – з 1986 г. працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, паэтэса, аўтар зборнікаў вершаў “Ластаўка ляціць” (1993), “Рысасловы” (1994), “Зачараваная краіна” (2007), “Горад Мілаград” (2016), фантастычных коміксаў “Агністыя дзьмухаўцы” (1997), кнігі вершаў з прысвячэннем “Зеленавокія воі і іх прыгажуні” (2001), кнігі літаратуразнаўчых твораў “Крышталёвы сад” (2007). Творы Л. Сільновай (вершы-малюнкі, “самаробныя” кнігі ў стылі “хэнд-мэйд-бук” або “арт-бук” і інш.) – прыклад адлюстравання новых, авангардных, мадэрнісцкіх кірункаў у беларускай літаратуры.

**Хрысціна Лялько** (нар. у 1956 г.) – беларуская пісьменніца і паэтэса, перакладчыца, аўтар кніг прозы “Дарога пад гару” (1985), “Світанак над бярозамі” (1989), кніг паэзіі “”На далонях любові” (2006), “Адвячорак” (2014). Працавала ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, штотыднёвіку “Літаратура і мастацтва”, часопісе “Беларусь”, галоўным рэдактарам каталіцкіх часопісш “Наша вера”, “Ave Maria” (выдавецтва “Про Хрысто”), пра якія сама ўзгадвае так: “Дзякуючы гэтым выданням многія класікі беларускай літаратуры былі раскрыты для чытача і як у некаторым сэнсе хрысціянскія пісьменнікі” [15].

Многім выпускніцам-філалагіням дапамагала адточваць іх паэтычны талент факультэцкае літаратурнае аб’яднанне “Узлёт”, якое існавала ў 1964 – 1989 гг. (узначальваў Алег Лойка). У свой час старастай гэтага аб’яднання была выдатная беларуская паэтэса, перакладчыца **Ала Канапелька** (1960–2015) – выпускніца БДУ 1983 г., аўтарка паэтычных зорнікаў “Цвет алешыны” (1985), “Летазлічэнне” (1999), перакладала на беларускую мову творы ўкраінскіх, курдскіх, малдаўскіх, балгарскіх паэтаў, сябра Саюза пісьменнікаў СССР з 1985 г., працавала загадчыкам сектара Дома літаратара СП БССР, загадчыкам аддзела Беларускага фонду культуры, у часопісе “Полымя”, “Крыніца” і інш. Вельмі шчымліва гучаць радкі яе “Развітальнага верша”: *“У прыродзе ўсё рада: // мы навек, назаўжды! // То спрадвечная праўда // для травы і вады. // Ясна свецяць суквецці, // Прашумеў дождж і сціх… // Я прашу: // хоць на міг – // НЕ! // Ні слоўца аб смерці”* [8, с. 21].

У 1994 г. дыплом філолага пасля заканчэння БДУ атрымала **Людміла Рублеўская** (нар. у 1965 г.) – беларуская паэтэса, пісьменніца, літаратурны крытык, драматург, перакладчык, журналіст. Працавала ў часопісе “Першацвет”, газеце “Наша слова”, штотыднёвіку “Літаратура і мастацтва”, у 2003 – 2020 гг. аглядальніцай аддзела культуры газеты “СБ. Беларусь сегодня”, з верасня 2020 г. – у газеце “Звязда”. Л. Рублеўская мае багаты літаратурны плён: яна аўтарка зборнікаў паэзіі “Крокі на старых лесвіцах” (1990), “Адукацыя” (1990), “Замак месячнага сяйва” (1992), “Застаюся” (1996), “Балаган” (2000), “Рыцарскія хронікі” (2001), “Над замкавай вежай” (2003), “Шыпшына для Пані” (2007), “Вяртанне інфанты” (2015), кніг прозы “Старасвецкія міфы горада Б” (2002), “Сэрца мармуровага анёла” (2003, 2012), “Пярсцёнак апошняга імператара” (2005), “Ночы на Плябанскіх Млынах” (2013), “Сутарэнні Ромула” (2010), “Дагератып” (2017), “Пантофля Мнемазіны” (2018), серыі раманаў “Авантуры Пранціша Вырвіча” (2012 – 2020), шэрагу кніг для дзяцей, публіцыстычных артыкулаў, эсэ, перакладаў.

У сваю чаргу Л. Рублеўская разам з мужам В. Шніпам у 2002 г. стварылі літаратурную суполку “Літаратурны квартал” (пазней пераіменавана ў “Літаратурнае прадмесце”), якая аб’яднала вакол сябе новае пакаленне творцаў, у тым ліку выпускніц філфака БДУ. Сярод іх **Таццяна Барысюк** (нар. у 1971 г.), выпускніца БДУ 1995 г., аўтарка зборніка вершаў “Аўтапартрэт” (2002), шэрагу празаічных твораў, перакладаў; **Аксана Спрынчан** (нар. у 1973 г.), закончыла філфак БДУ у 1995 г., працавала рэдактарам у

выдавецтве “Беларуская энцыклапедыя”, з 2006 г. – рэдактар выдавецтва “Мастацкая літаратура”, аўтарка кніг паэзіі “Вершы ад А.” (2004), “ЖываЯ” (2008), “Кава з украінскім мёдам” (2017), SMS-п’ескі з антрактам-размовай праз тэлефон у сааўтарстве з Алесем Анціпенкам “Дарога і Шлях” (2006), беларускай энцыклапедыі пачуццяў “Хата для Моўчы” (2007), жаночага рамана “Беларускі дурань” (2011), твораў для дзяцей; **Наталля Капа (Казапалянская)** (нар. у 1984 г.) – аўтарка паэтычных зборнікаў “Панна каханка” (1998), “Бэзавыя дрэвы” (2002); **Наста Кудасава** (нар. у 1984 г.), выпускніца філфака 2006 г., скончыла магістратуру БДУ ў 2007 г., аўтарка зборнікаў паэзіі “Лісце маіх рук” (2006), “Рыбы” (2013), “Маё немаўля” (2016), “Вясна. Вуснам цесна” (2021); **Віка Трэнас** (нар. у 1984 г.), закончыла філфак БДУ ў 2007 г., беларуская паэтэса, крытык, публіцыст, перакладчык, працавала рэдактарам аддзела паэзіі часопіса “Маладосць”, аўтарка зборнікаў вершаў “Цуд канфіскаванага дзяцінства” (2005), “Экзістэнцыйны пейзаж” (2008).

Плённа працуе на ніве сучаснай жаночай паэзіі выпускніца філалагічнага факультэта БДУ 2004 г. **Марыя Мартысевіч** (нар. у 1982 г.) – беларуская паэтэса, пісьменніца, журналістка і перакладчыца, аўтарка кніг “Цмокі лятуць на нераст: эсэ ў вершах і прозе” (2008) і “Амбасада: вершы свае і чужыя” (2011). Працягнула добрую традыцыю працы на карысць “альма-матар” беларуская паэтэса, літаратуразнаўца **Вера Бурлак (Жыбуль, Джэці)** (нар. у 1977 г.). Закончыўшы філфак БДУ ў 2001 г., пасля аспірантуру БДУ ў 2004 г., атрымала вучоную ступень кандыдата філалагічных навук, працуе дацэнтам кафедры рускай літаратуры, даследуе дзіцячую літаратуру “сярэбранага веку”. Аўтарка кніг паэзіі “За здаровы лад жыцця” (2003), “Забі ў сабе Сакрата!” (2008, сумесна з В. Жыбулем), кнігі прозы “Творы соннага жанру” (2011), аўдыёкнігі Phantom of the Literature (2006), кнігі эксерыментальных вершаў, замалёвак і п’ес “Дзеці і здані” (2012) і інш.

Наш пералік літаратарак-выпускніц БДУ можна яшчэ доўга працягваць, бо па-за ўвагай дадзенага артыкула засталіся выдатныя творцы, выпускніцы іншых факультэтаў БДУ, напрыклад, факультэта журналістыкі (Нэлі Тулупава, Таццяна Сапач, Алена Брава і інш.), гістарычнага факультэта (Валянціна Аксак  і інш.), хімічнага факультэта (Галіна Булыка і інш.) і іншых факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. Што тычыцца філалагічнага факультэта, то тут пералік, канешне ж, не поўны, тым больш, што падрастае ўжо новае пакаленне творцаў, якое гуртуецца на базе літаратурнага аб’яднання “Альтанка” і якім з 2008 г. па 2021 г. кіравала **Ірына Багдановіч** – беларуская паэтэса і літаратуразнаўца, якая хоць сама і не заканчвала філалагічнага факультэта БДУ, але працавала ў ім з 1996 г. па 2021 г. дацэнтам кафедры гісторыі беларускай літаратуры і шчодра дзялілася сваімі паэтычнымі навыкамі са студэнтамі. І. Багдановіч – аўтарка зборнікаў вершаў “Чаравікі маленства” (1985), “Фрэскі” (1989), “Вялікдзень” (1993), “Сармацкі альбом” (2004), “Прыватныя рымляне” (2006), “Душа лістападу” (2012), “Залатая горка” (2016). Яе паэзія – “паэтычны роздум пра сутнасць чалавечага жыцця і ролі ў ім творчасці, аб тых духоўных арыенцірах, якія задаюць нябёсны вектар зямному існаванню, аб незгасальных патрыятычных ідэалах, што асвячаюць сувязь чалавека з роднай зямлёй і яе гісторыяй” [14, с. 505]. Пагэтаму мы ўпэўнены, што будучае ў філалагічнага факультэта БДУ багатае і таленавітае.


1. Бліскавіцы: анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду / уклад., камент. А. Данільчык, В. Жыбуля. – Мінск: Кнігазбор, 2017. – 448 с.
2. Вярба, В. Альфа: рукапіс паэмы / В. Вярба // БДАМЛМ. – Фонд 55. – Воп. 1. – Справа 317. – Арк. 1 – 7.
3. Вярба, В. Апошні верасень. Выбранае: вершы і паэмы / В. Вярба. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 270 с.
4. Вярба, В. Белыя пісьмы: вершы, паэмы / В. Вярба. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 430 с.
5. Гарэцкі, Р. Браты Гарэцкія / Р. Гарэцкі. – Мінск: Медысонт, 2008. – 344 с.
6. “Гілевіч і Быкаў выхавалі палесскую разумніцу” / Рацыя: беларускае радыё // [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.racyja.com/kultura/192411/ – Дата доступу: 07.02.2022.
7. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст. / уклад. Гніламёдаў У.В., Лаўшук С.С. У 4 тамах. Том 3. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 952 с.
8. Канапелька, А. Летазлічэнне: вершы / А. Канапелька. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 127 с.
9. Каржанеўская, Г. Невымоўнае: вершы / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 287 с.
10. Кароткая гісторыя БДУ // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: афіцыйны сайт // [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://time.bsu.by/ru/bsu-hist.html – Дата доступу: 07.02.2022.
11. Цётка. Выбраныя творы / Цётка. Мінск: МГА “Беларускі кнігазбор”, 2001. – 333 с.
12. Шматкова, І.І. Беларуская жаночая паэзія другой паловы ХХ стагоддзя / І.І. Шматкова. – Мінск: РІВШ, 2017. – 144 с. // [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/187738/1/Bel_zhan_poesia_20.pdf – Дата доступу: 07.07.2021.
13. Шматкова, І.І. Наталіцца роднасці святлом…: Агульнае і адметнае ў творчасці Е. Лось, Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай / І.І. Шматкова. – Мінск: Ковчег, 2011. – 148 с. [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.elibrary.ru/item.asp?id=32836393 – Дата доступу: 07.02.2022.
14. 14.Шматкова, І.І. Экзістэнцыйныя пошукі паэзіі Ірыны Багдановіч / І.І. Шматкова // Язык и межкультурная коммуникация: современные векторы развития: сб. науч. статей по материалам II Междунар. научно-практ. конф., УО ”Полесский государственный университет“, г. Пинск, март 2021 г. / [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.elibrary.ru/item.asp?id=45426330 – Дата доступу: 07.02.2022.

15. «Я з тых, хто рукамі і зубамі трымаецца за родную зямлю» // Лідская газета // [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: http://lidanews.by/news/culture/6216news.html – Дата доступу: 07.02.2022.
16. Янішчыц, Я. У шуме жытняга святла: вершы, паэмы / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 414 с.